# Звяры Беларусі

СУМЕСНА мы ствараем адзіны пачуццевы свет — той, які пашыраецца на планеце, наладжвае стваральнасць на ёй. Звяры прыходзяць у нашае ўяўленне ў раннім маленстве. У калыханках, забаўлянках здымаецца і заслона з быццёвай таямнічасці (“У куце сядзіць мядзведзь, хустку вышывае. А лісічка-невялічка хатку прыбірае”) ці гучыць перасцярога («Прыйдзе шэранькі ваўчок, цябе схопіць за бачок”). Затое ў казках шырока перададзены характар лясных звяроў, разнастайна адлюстраваны іх паводзіны. Спакваля ўзнікае адчуванне: мы вельмі падобныя з імі, нават блізкія многімі рысамі. Спрадвеку склаліся такія параўнанні: злы, як воўк; топчашся, як мядзведзь; скачаш (ці круцішся), як вавёрка; хітры, як стары ліс; палахлівы, як заяц.

Мы так гаворым як пра блізкіх, знаёмых, хоць з некаторымі ляснымі жывелінамі нават не сустракаліся ў рэчаіснасці. Яны жывуць удалечыні, пазбягаюць сустрэчы з людзьмі, асцерагаюцца іх.

Цягам часу, з узростам, са сталеннем мы больш спазнаём пра «братоў нашых меншых», якія ўзніклі на планеце на ладны часавы парадак раней за нас. (Тое, што вы вучым, спасцігаем у школе, у жывёлаў закладзена ў генетычную памяць, на генным узроўні перадаецца патомству. Яны здольныя арыентавацца ў прасторы, адчуваць магнітныя хвалі і інш. Любоў да родных мясцінаў выяўляецца ў жывёлаў на падсвядомым узроўні.

У навуковай і мастацкай літаратуры паказана нялегкае, часта драматычнае жыццё жывёл, у якім змаганне за існаванне, за выжыванне прымушае іх быць назіральнымі, пільнымі, кемлівымі, мужнымі, суровымі, агрэсіўнымі. Кінематограф (асабліва савецкі) зрабіў лясных жыхароў абаяльнымі, радушнымі, дружалюбнымі і яшчэ больш узмацніў думку пра нашу падобнасць. (Варта толькі ўспомніць мультсерыял «Ну, пачакай!”, дзе паводзіны ваўка і зайца ілюсгруюць людскія ўзаемаадносіны ў жартоўным, нават анекдатычным, плане.) У беларускай дзіцячай літаратуры, як і ў сусветнай, вобразы жывёл пазначаны людскімі якасцямі і рысамі.

У казках найбольш глыбока і вельмі мудра ўвасоблена народнае мастацкае ўяўленне пра навакольную прастору. У іх людскі і жывёльны (а таксама і раслінны) свет цесна суадносяцца, пераасэнсоўваюцца, і выбудоўваецца іерархічнае становішча. Выхаваныя на класічнай літаратуры, у т.п. і на казках розных народаў, дзеці, а таксама дарослыя, уяўляюць свет, дзе царом звяроў выступае леў, рангам ніжэй — тыгр і г.д, Мо і так, калі разглядаць (вядома, у літаратурным аспекце) з'явы ў планетарным маштабе. Але ж ільвы і тыгры ў нас не жывуць.

УСЁ на свеце арганічна звязана з канкрэтнай прастораю, і кожны (чалавек, жывёліна, расліна) нясе на сабе яе адмеціны. Беларуская прастора блізкая да літоўскай, паўднёва-латвійскай, заходне-рускай, паўночна-ўкраінскай, усходне-польскай, а разам з імі складае маляўнічую духоўна-энергетычную зонупланеты.

Гэта лясны край з мноствам азёр, рэк і рэчак. У суладдзі з геаірафічнымі ўмовамі разгортваецца жыццё жывёл. Нацыянальныя фальклорныя творы своеасабліва перадаюць узаемаадносіны жывёл, людзей і жывёл, ствараюць іерархічную карціну ў навакальным свеце. Верхаводам у беларускіх казках выступае мядзведзь. А найбольш актыўныя персанажы — воўк, ліса і заяц (і ў рэчаіснасці беларусы найчасцей сустракаюцца з імі). У суровыя зімовыя ночы сялянскае падвор'е могуць наведаць і воўк, і ліс.

Воўк селіцца ў глыбіні лесу, у цяжкадаступных месцах, бліжэй да вады. Робіць логава ў карэннях дрэў, у норах. Корміцца дзікімі жывёламі, падаллю (таму лічыцца санітарам лесу), нападае на свойскіх жывёл. Вельмі актыўны ноччу, у пошуках яды прабягае да 50 км. Жыве 10— 15 гадоў.

З выгляду воўк падобны на сабаку: даўжыня цела 1,1 — 1,4 м, вага — 25—54 кг; шыя кароткая, ногі доўгія; поўсць на спіне і баках бура-карычневая, цёмна-шэрая. Ён вельмі асцярожны і кемлівы. І прыкладны сямейнік, трымаецца параю. Ваўкі — вельмі клапатлівыя

бацькі. Вясною ў іх нараджаецца 4 — 6 ваўчанят (і болей). У першы год сумеснага жыцця (полаўзростава спеласць у 2 гады) ваўчыца даглядае і вучыць сваіх дзяцей. На другі год першы вывадак выступае ў ролі настаўнікаў для малодшых.

Ліс (так пазначаецца ў навуковай літаратуры) паводзінамі падобны на іншых звяроў. Гэта ў фальклорных творах (там выступае як “ Ліса», “Лісіца») падаецца хітрык каварным. Мо таму, што мае пушысты хвост, які большы за палову яго" цела (даўжыня цела — 70—80 см, а хваста — 36—45 см; вага — 5—7 кг). І колерам адметны: поўсць на спіне рыжа-чырвоная з серабрыстым адлівам (ліняе вясной і восенню). Жыве ўсяго 5—7 гадоў. Пашыраны паўсюль на Беларусі. Робіць норы (з 2—4 хадамі) на вырубках, пералесках, асушаных тарфяніках, часам у полі. Корміцца мышападобнымі грызунамі, птушкамі, насякомымі, ягадамі, палюе на свойскіх птушак.

Заяц можа і ўдзень заглянуць у сад, дзе падсілкуецца маладымі парасткамі яблыні, грушы, іх карой. Гэтыя лясныя звяркі (даўжыня цела — 55 — 70 см) харчуюцца травяністай расліннасцю, а зімой — маладымі парасткамі і карой асіны, вярбы, кустарнікаў. У нашым краі існуюць 2 віды: заяц-бяляк — у лясах паўночнай і цэнтральнай частак (рэдка на Палессі) і заяц-русак, які жыве паўсюль: на палях, лясных палянах, вырубках, пералесках. Каб выжыць, яны мусяць прыстасоўвацца да мясцовых умоў, і таму пры ліньцы колер іх поўсці прыпадабняецца да наваколля. У зайца-русака поўсць летам карычнevata-вохрыста-шэрая з цёмным стракатым малюнкам, а зімою — святлей, а ў зайца-беляка — бурая з рыжаватым адценнем, зімой — белая. Колькасць зайцоў хутка павялічваецца. З лютага да верасня яны прыносяць 2—3 прыплоды па 2—5 зайчанят. Маладняк не мае паху, таму ні воўк, ні ліс не могуць яго ўнюхаць. Нават маці, адзін раз пакарміўшы дзіця, рэдка пабачыць яго потым (напоіць малаком другая зайчыха, якая будзе прабягаць побач). У зайцоў незайздросная доля: на іх палююць драпежныя звяры і птушкі, і людзі адстрэльваюць. Штогод у нас нарыхтоўваецца 40—50 тыс. заечых шкурак.

Вырашальнае слова ў звярыным гурце належыць мядзведзю. (Так падаецца ў казачных аповедах.) Выглядам ён нагадвае чалавек: можа хадзіць на задніх лапах, любіць мед, лазіць па дрэвах. Ростам каля 2 м (і болей), вагой да 300 кг, працягласць жыцця — 15—20 гадоў. Як і чалавек, ён усёедны. Есць травы, іх карэнішчы, ягады, арэхі, жалуды, мурашак, чарвякоў, нападае на буйных жывёл, робіць патравы аўса. Летам назапашвае тлушчу і ў лістападзе — снежні зарягае спаць да красавіка ў бярлогу ў густым ельніку ці ў бураломе. Там, у канцы зімы, мядзведзіца і нараджае аднаго-двух медзведзянятак.

Мядзведзь — кемлівая, дружалюбная жывёліна, лёгка паддаецца дрэсіроўцы. Выступае ў цырку. Раней вывучанага мядзведзя вадзілі з сабою скамарохі па гарадах і мястэчках, заглядвалі і ў вёскі. Яшчэ ў канцы XIX ст. сустрэць мядзведзя ў лесе было звычайнай справай, а на пачатку XX ст. такое стала рэдкасцю. Цяпер на Беларусі болей за сотню гэтых дзіўных жывёлін.

Менш месца адведзена дзіку, ці дзікаму кабану, у казках, але ў лесе, на лясной паляне можна сустрэць гэтую жывёліну, блізкую да свойскіх свіней. Дзік, часам самка з паўтузінам парасят (нараджаюцца ў сакавіку — красавіку) шныраць у лесе ў пошуках яды. Харчуюцца жалудамі, раслінамі, грызунамі, лічынкамі насякомых, дажджавымі чарвякамі, робяць патраву на загонах бульбы, пасевах аўса. Жывуць яны паўсюль на Беларусі, агульная колькасць больш за 30 тыс. галоў, штогод праводзіцца адстрэл 2—3 тыс. дзікоў.

А гэтая лясная госця ўтульна адчувае сябе ў парках гарадоў. Нават у цэнтры сталіцы, у паркавым масіве, што працягнуўся ўздоўж Свіслачы паміж вуліцамі Максіма Багдановіча і Першамайскай, вавёрка грацыёзна пераскоквае з дрэва на дрэва, падыходзіць да людзей. Прыцягвае ўвагу яе пушысты чырвона-буры хвост, які па даўжыні роўны амаль целу (даўжыня цела — 20—30 см, хваста —12—22 см, а вага — 420 г). Пачынае размнажацца ў 9— 12 месяцаў і за сезон робіць два прыплоды па 4—6 (часам і болей) ваверчанят (у лютым — пачатку сакавіка і ў канцы красавіка — маі). Таму цяпер іх налічваецца ў нас каля 150 тыс. галоў, хоць штогод нарыхтоўваецца больш за 25 тыс. іх шкурак. Ваверкі жывуць у дуплах, шарападобных гнёздах, кормяцца арэхамі, грыбамі, часам насякомымі і іншымі жывёламі, робяць запасы.

Бліжэй да людзей падаўся і вожык. Сваё гняздо ў густой траве ці пад апалай хвояй, лісцем, у нары ен робіць у лесапарках, каля

садовых участкаў. Корміцца як пладамі, ягадамі, так і насякомымі, жабамі, яшчаркамі, мышападобнымі фызунамі. Яго цела, зверху і збоку пакрытае калючкамі, недаступнае для драпежнікаў.

ЖЫВУЦЬ у нашых лясах статны лось і стройная касуля, асцярожная рысь і абачлівы барсук. Каля вадаёмаў, рэк таксама бурна разгортваецца змаганне за выжыванне. Здзіўляе сваёй мэтанакіраванасцю бабёр. Жыве сям'ёй, будуе хатку вышынёй за 3 м, а дыяметрам у аснове да 12 м, узводзіць плаціны даўжынёй часам да 100—200 м. Увесь час заняты будаўніцтвам, на зіму пад вадой робіць запасы харчу з галінак.

Дзікія жывёлы трывала ўвайшлі ў духоўны свет чалавека. Ён захапляеціца іх імкненнем жыць вольна, мужнасцю і адвагай, якія выяўляюцца пры абароне патомства, сілай і смеласцю ў час перадшлюбнага спаборніцтва. Але ж чалавек выкарыстоўвае дзікіх жывёл і для спажывецкіх патрэбаў. Мядзведзь, ліс, вавёрка, выдра, бабёр, куніца — каштоўныя для яго сваім футрам. Лось, дзік, заяц з'яўляюцца крыніцай для мясной прадукцыі.

З-за прагаатычных памкненняў чалавеку часта даводзіцца выступаць знішчальнікам жывой прыроды. Па яго віне зніклі многія жывёлы на планеце. Яшчэ ў XVIII ст. у нашых лясах вадзіліся собаль, расамаха, куніца, сустракаліся высакародны алень, тарпан (лясны конь). На пачатку XX ст. знішчаны дзікі кот, зубр.

Дзейнасць чалавека значна ўплывае на жыццё дзікіх жывёл. З пашырэннем земляробства зменшылася плошча лясных масіваў, што вельмі пагоршыла ўмовы для існавання лясных жыхароў. Некаторыя з іх — ліс, заяц, вожык, ваверка — сталі жыць і непадалёк ад людзей. Каля населеных пунктаў, нават непасрэдна ў іх, пасяліліся тхор, ласка, чорны пацук.

Суладнасць суседскага існавання чалавека і жывёл наладжваецца. У нацыянальных парках, запаведніках, заказніках нашай краіны ўзнаўляюцца віды жывёл, колькасць якіх мінімальная і патрабуе аховы. Будзем спадзявацца, што цывілізаваны свет людзей здолее зберагчы натуральныя ўмовы для жыцця дзікіх жывел.

***Падрыхтаваў МіхасьШАВЫРКІН***

**Источник:** Пралеска.-2009.-№6.-С.58-59.